*Стасевіч А. А.*

# ДОКТАР МЕДЫЦЫНЫ І АКУЛІСТЫКІ САЛАМЕЯ РУСЕЦКАЯ

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Ратынская Н. В.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Часта мы не ведаем сваіх каранёў, сваіх продкаў, выдатных калег з мінуўшчыны.Многія сучасныя ўрачы не выключэнне, але ж дзякуючы тым адкрыццям, якія былі зроблены нашымі калегамі ў далёкім мінулым, мы можам і зараз лячыць людзей, прымяняць іх дасягненні.

Саламея Русецкая – унікальная лекарка-самавучка. Дякуючы свайму энтузіязму і жаданню дапамагчы, яна дабілася вялікага поспеху ў медыцыне. Наваградчанка, што лячыла царыц і наложніц султана, рабаўнікоў і вяльможных Радзівілаў, простых пецярбургскіх мяшчан, якую нястомная прага падарожжаў кідала то ў Стамбул, то ў Нясвіж, то ў Пецярбург, то ў Сафію, Рыгу, Любляну і мноства іншых месцаў, выратавала жыццё не аднаму чалавеку. “Доктар медыцыны і акулістыкі”, як яна сама сябе называла, была першай жанчынай таго часу, што лячыла людзей без аніякай медыцынскай адукацыі.

Часта лекарка давярала інтуіцыі, напрыклад, у Пецярбурзе яна выводзіла нованароджанага са стану асфіксіі, накрыўшы яго квашняй. І гэтым прыёмам яна падзялілася з павітухамі з Наваградчыны. Многа лячыла Саламея “зёлкамі”, вядомы выпадкі вылечвання з іх дапамогай кан’юктывіту, мочакаменнай хваробы. Першая жанчына-лекарка аперыравала ў далекім мінулым, не кожны лекар таго часу мог выканаць такія складаныя аперацыі.Саламея апісвае, як яна праз полую трубачку высмоктвала катаракту ў маладой дзяўчыны. Лекарка ўсім хворым рэкамендавала захоўваць чысціню, больш рухацца.

А галоўнае,чаму тады вучыла Саламея, гэта тое, як трэба ставіцца да людзей – не проста, як да пацыента, а як да асобы, нягледзячы на іх стан.